# Віртуальныя фонды

## Што можна атрымаць па білету чытача ў абласной бібліятэцы імя Я. Карскага, акрамя кніг



ФОТА ЯНА ХВЕДЧЫНА

Калі кніга перастала быць выключна папяровай, фонды бібліятэк становяцца практычна бязмежнымі: дастаткова быць чытачом адной, каб «браць» літаратуру ў кніжніцах іншых гарадоў і нават краін. Напрыклад, гродзенцам даступныя выданні, якія прадстаўлены ва «Універсітэцкай бібліятэцы анлайн» віртуальнай чытальнай залы Нацыянальнай бібліятэкі. Ці кнігі з бібліятэкі «ЛитРес».

«Трапіць» у іншыя бібліятэкі і ўзяць з віртуальнай паліцы патрэбнае выданне можна ў зале электронных рэсурсаў абласной бібліятэкі імя Карскага. Раскажам, што і дзе можна знайсці.

*– Нашы чытачы маюць магчымасць доступу да паўнатэкставых баз дадзеных прававой тэматыкі «Эталон» і «Эксперт». У іх – усе заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь, Міжнародныя дагаворы, рашэнні органаў мясцовага кіравання і самакіравання, судовая і праваапрымяняльная практыка, формы дакументаў і многае іншае. Інфармацыя абнаўляецца штодня,* – распавяла **вядучы бібліёграф аддзела інфармацыйна-бібліяграфічнай работы Святлана Красуцкая.**

Больш за 100 тысяч кніг па ўсіх галінах ведаў ад вядучых расійскіх і беларускіх выдавецтваў можна знайсці ў электроннай бібліятэчнай сістэме «Універсітэцкая бібліятэка анлайн» віртуальнай чытальнай залы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Тут вучэбная і навуковая літаратура, энцыклапедыі, слоўнікі, дапаможнікі, ілюстраваныя выданні па мастацтве, публікацыі студэнцкіх навуковых работ, а таксама перыёдыка.

У зале электронных рэсурсаў ёсць медыятэка з запісамі музычных твораў, выступленняў палітыкаў, военачальнікаў і іншых вядомых людзей.

З другога квартала ў бібліятэцы зноў будзе адкрыты доступ чытачоў да базы дадзеных «ЛитРес», якая налічвае 250 тысяч мастацкіх і папулярных ліцэнзійных рускамоўных электронных і аўдыёкніг. Чытачы змогуць пакінуць свае пажаданні, якую кнігу з гэтай бібліятэкі яны хацелі б бачыць у гродзенскіх фондах. Іх прапановы будуць улічаны.

Да гэтых баз доступ адкрыты ў зале электронных рэсурсаў. Галоўнае – быць чытачом бібліятэкі імя Карскага.

Асаблівы гонар супрацоўнікаў кніжніцы – інфармацыйныя рэсурсы, якія яны ствараюць. Па-першае, гэта электронны каталог, дзе можна знайсці ўсе выданні з фондаў абласной бібліятэкі. Сёння ў ім больш за 730 тысяч запісаў: кнігі, артыкулы з перыёдыкі, аўтарэфераты дысертацый... Сюды ж у абавязковым парадку трапляюць усе новыя паступленні. Так што не выходзячы з дому можна даведацца, ці ёсць у гродзенскай бібліятэцы тое ці іншае выданне.

Яшчэ дзве ўнікальныя распрацоўкі супрацоўнікаў бібліятэкі – базы дадзеных «Гісторыка-культурныя каштоўнасці прынёманскага краю» і «Легенды Гродзеншчыны: галерэя знакамітых асоб». Гэта вынік працы супрацоўнікаў аддзелаў інфармацыйна-бібліяграфічнай працы і краязнаўства.

*– Аснову рэсурсу складаюць матэрыялы пра помнікі архітэктуры, археалогіі, гісторыі, горадабудаўніцтва, якія адзначаны ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей,* – расказала Святлана Красуцкая.

Матэрыялы аб аб'ектах дапаўняюцца архіўнымі і сучаснымі здымкамі, а таксама спісам літаратуры. Бібліяграфія – выдатны памочнік тым, хто хоча даведацца пра славутасці як мага больш.

База дадзеных ужо можа пахваліцца вялікім спісам уключаных у яе аб'ектаў. Праца над яе папаўненнем працягваецца.

Паступова з'яўляюцца новыя персаналіі і яшчэ ў адной базе дадзеных – «Легенды Гродзеншчыны: галерэя знакамітых асоб». Дзяржаўныя дзеячы, пісьменнікі, мастакі, ваеначальнікі, спартсмены, грамадскія дзеячы, кіраўнікі... Усе яны – вядомыя асобы, якія праславілі наш край за межамі краіны і чый лёс так ці інакш звязаны з Гродзеншчынай. Ёсць тут раздзелы, прысвечаныя Давыду Гарадзенскаму, Вітаўту, Ягайлу, Саламеі Дэшнер, Янку Брылю, Жану Эмануэлю Жылібер у, Яфіму Карскаму. З асоб, якіх ведалі і ведаюць сучаснікі, – Аляксандр Дубко, Аляксандр Курловіч, Віталь Крамко, Уладзімір Цэрабун, Васіль Равяка, Леанід Захлеўны і многія іншыя.

ТАЦЦЯНА МАСТОЎСКАЯ